Беларускі універсітэт культуры

# ХРОНІКА
# асноўных падзей Беларускага універсітэта культуры за 25 гадоў

Мінск 2000

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Выданне падрыхтавалі:*

А.І.Смагін — доктар мастацтвазнаўства, прафесар

В.Р.Языковіч — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аддзел рэдкай кнігі
бібліятэкі БУК

## 1975

*1 верасня* У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 4 мая 1975 г. і загадам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР на базе бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага і аддзялення культурна-асветнай работы Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута створаны Мінскі інстытут культуры.

Першым рэктарам Мінскага інстытута культуры прызначаны Аляксандр Лявонцьевіч Петрашкевіч.

На факультэтах бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, культурна-асветнай работы, завочнага навучання распачата падрыхтоўка кадраў па дзвюх спецыяльнасцях: бібліятэказнаўства і бібліяграфія і культурна-асветная работа. На першы курс прынята 575 чалавек. У структуры інстытута працавалі кафедры гісторыі КПСС і навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га камунізму; марксісцка-ленінскай філасофіі і палітычнай эканоміі; гісторыі СССР, БССР і замежных краін; літаратуры; замежных моў; фізічнага выхавання; бібліятэказнаўства; бібліяграфіі; тэхнічнай бібліяграфіі; культурна-асветнай работы; аркестравага дырыжыравання; харавога дырыжыравання; рэжысуры і майстэрства акцёра; асноў прыродазнаўства, прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці; гісторыі і тэорыі культуры, на якіх працавалі 189 выкладчыкаў, з іх 42 — дацэнты.

*6 кастрычніка* Урачыстае адкрыццё будынка Мінскага інстытута культуры.

*Лістапад* Загадам міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР зацверджаны савет Мінскага інстытута культуры.

Утвораны мастацкі савет інстытута.

*1 снежня* Адкрыта чытальная зала бібліятэкі Мінскага інстытута культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Створаны канцэртны хор «Мара» (маст. кіраўнік А.В.Пякуцька).

## 1976

*Студзень* Утвораны метадычны савет інстытута.

Утвораны савет па грамадскіх навуках.

*Сакавік* Праведзена першая навукова-творчая канферэнцыя выкладчыкаў на тэму: «Культасветработнік: якім яму быць?»

*Май* Рэктарам інстытута прызначаны Нічыпар Еўдакімавіч Пашкевіч.

*Чэрвень* Загадам рэктара створаны рэктарат.

Адбыўся першы выпуск спецыялістаў; інстытут скончылі 445 чалавек, з іх — 344 па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»; 101 — «культурна-асветная работа».

*Верасень* Утворана кафедра тэорыі музыкі і фартэпіяна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кастрычнік* Адкрыта падрыхтоўчае аддзяленне інстытута.

## 1977

*Сакавік* Уведзен у эксплуатацыю інтэрнат № 1.

Кафедра тэхнічнай бібліяграфіі і работы тэхнічных бібліятэк перайменавана ў кафедру тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі.

Створаны студэнцкі самадзейны тэатр.

*Чэрвень* Адкрыта кафедра дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі.

*Верасень* Утворана кафедра харэаграфіі.

Утворана кафедра рэжысуры клубных і масавых прадстаўленняў.

## 1978

*Май* Праведзены ў інстытуце першыя «Студэнцкія дні навукі».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1979

Рэктарам Мінскага інстытута культуры прызначаны
**Віктар Мітрафанавіч Пузікаў.**

Пачаўся штогадовы выпуск міжведамаснага навуковага зборніка «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства».

*Красавік* Створана кафедра духавых, эстрадных аркестраў і спецыяльнага інструмента.

Утвораны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі» (маст. кіраўнік С.Дробыш).

## 1980

За пяць гадоў падрыхтавана каля 2,5 тыс. спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і культурна-асветнай работы. На трох факультэтах інстытута вучыцца 3491 студэнт (1750 — на стацыянары; 1741 — на завочным аддзяленні). На 20 кафедрах інстытута працавалі 270 чалавек, з іх 3 прафесары, 35 дацэнтаў, 2 дактары і 72 кандыдаты навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1981

*Верасень* Загадам Міністэрства культуры і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР пры Мінскім інстытуце культуры створана Галіновая навукова-даследчая лабараторыя беларускай танцавальнай творчасці.

Уведзен у эксплуатацыю інтэрнат № 2.

*Кастрычнік* На базе кафедры культурна-асветнай работы і харавога дырыжыравання створаны наступныя кафедры: культурна-асветнай работы; псіхалогіі і педагогікі; харавога дырыжыравання; народна-харавых спеваў.

На базе інстытута пачалося выданне міжведамаснага навуковага зборніка «Пытанні культуры і мастацтва Беларусі».

## 1982

*Жнівень* Утвораны кафедры тэорыі і методыкі культурна-асветнай работы; арганізацыі і ўпраўлення культур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-асветнымі ўстановамі; грамадзянскай абароны і медыцынскай падрыхтоўкі.

*Лістапад* Кафедра духавых, эстрадных аркестраў і спецыяльнага інструмента перайменавана ў кафедру эстрадна-духавога дырыжыравання.

Створаны ансамбль «Натхненне» (маст. кіраўнік С.П.Салдатава).

Створаны эстрадна-сімфанічны аркестр (маст.кіраўнік М.М.Салдатаў).

1983

Кафедра тэорыі музыкі і фартэпіяна рэарганізавана ў дзве кафедры: тэорыі музыкі, фартэпіяна.

1984

Кафедра рэжысуры клубных масавых прадстаўленняў перайменавана ў кафедру рэжысуры масавых свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1985

*10-годдзе інстытута*

За дзесяць гадоў у Мінскім інстытуце культуры падрыхтавана больш за 6000 спецыялістаў. На трох факультэтах навучаліся 4115 чалавек (на дзённым аддзяленні — 1671 чалавек, на завочным — 2444). На 26 кафедрах працавалі 356 выкладчыкаў, у тым ліку 12 прафесараў, 99 дацэнтаў.

## 1986

*Жнівень* На базе факультэта культурна-асветнай работы ўтвораны факультэт культурна-асветнай работы і рэжысуры і факультэт самадзейнага музычнага і харэаграфічнага мастацтва.

## 1987

*Люты* Утвораны кафедры агульнай бібліяграфіі; галіновай бібліяграфіі і дакументазнаўства; інфарматыкі і тэхнічных сродкаў; арганізавана кафедра рускай мовы як замежнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Створана лабараторыя «Навуковыя асновы рэкрэалогіі».

Створаны ансамбль акардэаністаў «Туцці» (маст. кіраўнік Л.А.Сухаварава).

## 1988

*Сакавік* Рэктарам Мінскага інстытута культуры прызначаны Мікалай Мікалаевіч Заранок.

На базе кафедры бібліятэказнаўства створаны кафедра бібліятэказнаўства і кафедра фондаў і каталогаў.

*Жнівень* Мінскі інстытут культуры перападпарадкаваны Міністэрству культуры БССР.

## 1989

Адкрыта аспірантура. Пачата падрыхтоўка па спецыяльнасці 05.25.03 «тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветнай дзейнасці».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінскаму інстытуту культуры нададзена права выдання вучэбна-метадычнай і навуковай літаратуры.

Утвораны навукова-даследчы сектар, савет па замежных сувязях.

Створаны вакальны анçамбль выкладчыкаў «Рэтра» (маст. кіраўнік З.Л.Леановіч).

Створаны канцэртна-духавы аркестр «Светач» (маст. кіраўнік В.М.Парамонаў).

1990

Кафедра эстрадна-духавога дырыжыравання падзелена на кафедру эстрадных аркестраў і ансамбляў і кафедру духавых аркестраў.

Створаны ансамбль фларнетыстаў «Vivace» (маст. кіраўнік Л.Р.Акапджанян) і ансамбль «Мроя» (маст. кіраўнік Ф.В.Юрцэвіч).

1991

Кафедра гісторыі КПСС перайменавана ў кафедру палітычнай гісторыі, кафедра навуковага ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мунізму — у кафедру тэорыі сацыялізму, кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі — у кафедру філасофіі.

Створана кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці.

1992

*Лістапад* Рэктарам выбрана Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч.

Распачата падрыхтоўка бібліятэчных кадраў па скарочаным тэрміне навучання на базе сярэдняй спецыяльнай бібліятэчнай адукацыі.

Створаны мужчынскі хор «Віват» (маст. кіраўнік А.В.Пякуцька).

Справаводства пераведзена на беларускую мову.

1993

*Люты* Адбылася маштабная рэарганізацыя структуры інстытута.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі перайменаваны ў факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. Рэарганізаваны кафедры факультэта БІС: скасаваны кафедра фондаў і каталогаў, кафедра галіновых бібліяграфій і дакументазнаўства; узбуйнены кафедры бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і дакументазнаўства.

Створаны кафедры: сацыялогіі і культуразнаўства; беларускай мовы і літаратуры; кафедра рускай мовы як замежнай пераўтворана ў кафедру лінгвістыкі і беларусазнаўства; удакладнена назва кафедры гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Факультэт культурна-асветнай работы і рэжысуры пераўтвораны ў факультэт культуралогіі.

Утвораны кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры; менеджменту сацыяльна-культурнай сферы; народных рамёстваў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перайменаваны:
кафедра рэжысуры масавых свят — у кафедру рэжысуры свят; кафедра рэжысуры і майстэрства акцёра — у кафедру арганізацыі тэатральнай творчасці.

Факультэт самадзейнага музычнага і харэаграфічнага мастацтва перайменаваны ў факультэт мастацкай творчасці;
кафедра духавых аркестраў — у кафедру духавой музыкі;
кафедра эстрадных аркестраў і ансамбляў — у кафедру эстраднай музыкі;
кафедра аркестравага дырыжыравання — у кафедру народнаінструментальнай творчасці;
кафедра харавога дырыжыравання — у кафедру харавога мастацтва;
кафедра народна-харавых спеваў — у кафедру беларускай народнапесеннай творчасці.

Скасаваны кафедры эканомікі культуры, сацыялогіі культуры і тэорыі культуры; грамадзянскай абароны і медыцынскай падрыхтоўкі; самадзейнай мастацкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці; арганізацыі і кіравання культурна-асветнай работай.

Распачата падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасцях «мастацтва эстрады», «сацыяльная педагогіка», «сацыяльная работа» (спецыялізацыя «сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя асобы мастацтвам»); спецыялізацыях «сусветная і айчынная мастацкая культура», «менеджмент сацыякультурнай сферы», «бальны танец», «народны танец», «эстрадны танец» і інш.

Адкрыта майстэрня саломапляцення і мастацкага роспісу.

Навучальны працэс пераведзены на беларускую мову.

*30 верасня* Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Мінскі інстытут культуры пераўтвораны ў Беларускі універсітэт культуры.

Створаны ансамбль кафедры харэаграфіі (маст. кіраўнік С.В.Гуткоўская).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Створаны хор старадаўняй музыкі «Дабравест» (маст. кіраўнік А.В.Пякуцька).

## 1994

Распачата падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасцях «літаратурная работа», «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры» і спецыялізацыях «бібліятэказнаўства і беларуская мова», «бібліятэказнаўства і замежная мова», «народныя абрады і святы».

Кафедра эстраднай музыкі перайменавана ў кафедру мастацтва эстрады.

50-годдзе факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Утвораны аддзел замежных сувязей.

Заключаны міжнародныя пагадненні Беларускага універсітэта культуры з Вышэйшай школай Алісы Саламон (Германія), Шленскім універсітэтам (Польшча), Гедвідскай вышэйшай школай (Данія).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Май* Створаны фальклорны ансамбль «Грамніцы» (маст. кіраўнік У.Зяневіч).

*Верасень* Утворана навуковая рада.

Распачата падрыхтоўка аспірантаў па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры».

Створаны ансамбль духавой музыкі «Брас-шоу» (маст. кіраўнік І.А.Мангушаў).

1995

*20-годдзе універсітэта*

За гэтыя гады падрыхтавана 13 794 спецыялісты. На чатырох факультэтах універсітэта навучаюцца больш за 3,5 тыс. студэнтаў. На 28 кафедрах працуюць звыш 20 прафесараў, дактароў навук, каля 130 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Агульны фонд бібліятэкі універсітэта налічвае каля 500 тыс. кніг, у тым ліку каля 5 тыс. рэдкіх выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кастрычнік* Адкрыты аддзел рэдкай кнігі.

Распачата падрыхтоўка спецыялістаў на базе спецыяльнай сярэдняй адукацыі па скарочаным (3-гадовым) вучэбным плане на аснове дагавораў з Мінскім лінгвагуманітарным комплексам гімназія-каледж № 24 і Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам.

Утворана кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры.

Кафедра інфарматыкі і тэхнічных сродкаў пераўтворана ў кафедру аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Распачата падрыхтоўка па бакалаўрскіх праграмах.

Утворана студэнцкае навуковае таварыства.

Утворан музей Беларускага універсітэта культуры.

Распачата падрыхтоўка кадраў па наступных спецыялізацыях:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«бібліятэказнаўства і краязнаўства», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі», «кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю».

Створаны народны ансамбль «Баламуты» (маст. кіраўнік В.І.Трамбіцкая).

1996

Адкрыта магістратура па спецыяльнасцях «культуралогія», «мастацтвазнаўства», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры».

*Кастрычнік* Праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць».

Адкрыты Мазырскі філіял факультэта завочнага навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Утвораны моўны цэнтр, абсталяванне і праграмнае забеспячэнне падорана Мюнстэрскім універсітэтам, Германія.

Загадам ВАК Беларусі зацверджаны савет па абароне дысертацый К 09.03.01 па спецыяльнасцях 05.25.03 «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» і 13.00.05 «тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветнай дзейнасці».

Заключаны міжнародныя пагадненні паміж універсітэтам і Вышэйшай педагагічнай школай у Ольштыне (Польшча), а таксама Вестфальскім універсітэтам імя Вільгельма (Германія).

*Снежань* Адбылася першая абарона дысертацыі ў Беларускім універсітэце культуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачата падрыхтоўка аспірантаў па спецыяльнасцях 17.00.09 «тэорыя мастацтва» і 17.00.01 «тэорыя культуры».

1997

Створаны аддзел выхаваўчай работы.

*19—23 мая* Правядзенне міжнароднага семінара «Бібліятэкі і бібліятэчная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь і ЗША: канструктыўны дыялог і супрацоўніцтва».

*23 мая* У Беларускім універсітэце культуры праведзены Першыя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры.

*Чэрвень* Адбыўся першы выпуск магістратуры. Адбыўся першы выпуск бакалаўраў.

*29—31 кастрычніка* Міжнародны семінар «Перспектыўныя напрамкі развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ў кантэксце сусветных тэндэнцый».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распачата падрыхтоўка аспірантаў па спецыяльнасці 24.00.03 "музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў".

*Лістапад* Утвораны прэс-цэнтр Беларускага універсітэта культуры.

Створаны студэнцкі эстрадны аркестр «Біг-Бэнд» (маст. кіраўнік В.І.Каназа).

Заключана міжнароднае пагадненне з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтва (Расія).

## 1998

*Сакавік* Утворана каардынацыйная рада па справах студэнцкай моладзі і выхаваўчай рабоце.

*Ліпень* Адкрыта дактарантура.

Загадам ВАК Беларусі ў Беларускім універсітэце культуры зацверджаны савет па абароне ды-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сертацый Д 09.03.01 па спецыяльнасці 17.00.09 "тэорыя мастацтва"

*Снежань* Загадам ВАК Беларусі ў Беларускім універсітэце культуры зацверджаны савет па абароне дысертацый Д 09.03.02 па спецыяльнасці 24.00.01 "тэорыя культуры".

Адбылася першая абарона доктарскай дысертацыі ў Беларускім універсітэце культуры па спецыяльнасці «тэорыя мастацтва» загадчыкам кафедры тэорыі музыкі А.І.Смагіным.

Заключаны міжнародныя пагадненні універсітэта з Краснадарскай дзяржаўнай акадэміяй культуры і мастацтва (Расія), Ровенскім гуманітарным універсітэтам культуры (Украіна) і Ровенскім эканоміка-гуманітарным інстытутам (Украіна).

Набыты набор музычных інструментаў для кафедры мастацтва эс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трады па гранту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## 1999

*Студзень* Утвораны савет кафедраў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

*Чэрвень* Утвораны навукова-даследчы аддзел.

*Верасень* Адкрыта міні-тыпаграфія універсітэта, набытая за грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

*7 кастрычніка* На базе Беларускага універсітэта культуры праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Універсітэты Ельскіх».

*Лістапад* Праведзен I Міжнародны конкурс па спартыўных танцах сусветнай кваліфікацыі International open «Minsk open 99».

*Снежань* Створана вучэбная камп'ютэрная лабараторыя пры кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм на базе абсталя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання, падоранага пасольствам ЗША.

Заключаны міжнародныя пагадненні універсітэта з Кіеўскім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтва (Украіна) і Вялікатырнаўскім універсітэтам (Балгарыя).

*26 лістапада* Загадам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 703 Беларускаму універсітэту культуры нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сферы культуры ў нацыянальнай сістэме адукацыі.

*30 снежня* Прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах сацыяльнай падтрымкі работнікаў, аспірантаў і студэнтаў Беларускага універсітэта культуры» ў сувязі з наданнем статуса вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сферы культуры.

Адбылася першая абарона доктарскай дысертацыі ў Беларускім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

універсітэце культуры па спецыяльнасці «культуралогія» прарэктарам А.І.Смолікам.

2000

*18 студзеня* Прэзентацыя аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры, набытай на грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

*Май* Утворана навукова-творчая лабараторыя беларускіх народных музычных інструментаў.

23—26 мая На базе Беларускага універсітэта культуры праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне».

*25-годдзе універсітэта*

За 25 гадоў у Беларускім універсітэце культуры падрыхтавана каля 16 тыс. высокакваліфікаваных спецыялістаў. Ва універсітэце навучаецца каля 4 тыс. студэнтаў па 12 спецыяльнасцях і 43 спецыялізацыях, праходзяць падрыхтоўку 57 аспірантаў і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22 магістранты, 2 дактаранты, 74 суіскальнікі.

У структуры універсітэта чатыры факультэты, Мазырскі філіял, 25 кафедраў, на якіх працуюць 457 выкладчыкаў, у тым ліку 18 прафесараў, 82 дацэнты, 13 дактароў і 94 кандыдаты навук, вучэбны аддзел, аддзел кадраў, аспірантура, адміністрацыйна-гаспадарчая частка, падрыхтоўчыя курсы, аддзел выхаваўчай работы, аддзел замежных сувязей, рэдакцыйна-выдавецкі аддзел, навукова-даследчы аддзел, спартыўны клуб, студэнцкі клуб, бібліятэка з аддзелам рэдкай кнігі, шэраг лабараторый, моўны цэнтр. Ва універсітэце створаны звыш 50 мастацкіх калектываў. Вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па скарочаным тэрміне навучання на аснове дагавораў з Мінскім вучэбным комплексам гімназія-каледж № 24 і Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам.

У Беларускім універсітэце культуры створана сістэма бесперапыннай адукацыі: каледж—ВНУ—магістратура, аспірантура, дактарантура з абаронай кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Інфармацыйнае выданне*

ХРОНІКА АСНОЎНЫХ ПАДЗЕЙ
БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ
ЗА 25 ГАДОЎ

Падп. у друк 15.11.2000 г. Фармат 60 x 84 1/16.
Папера пісчая № 2. Друк глыбокі. Ум. друк. арк. 1,63.
Ул-выд. арк. 1,43. Тыраж 100 экз. Заказ 243.

Беларускі універсітэт культуры
220001 г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія ЛВ № 283 ад 22.04.1998 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага універсітэта культуры
220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17